# Якога маштабу дасягнулі схемы вываду грошай з бюджэту праз падазроныя схемы з удзелам найвышэйшых уладаў?

**Урваць напаследак – гэтак знаны аналітык Сяргей Чалы ацаніў дзеянні ўладаў у справе раздачы кармленняў блізкім да сябе бізнесоўцам за апошнія гады. Наколькі гэта праўда і як гэта адбываецца на практыцы? Якога маштабу дасягнулі схемы ўводу грошай з бюджэту праз падазроныя схемы з удзелам найвышэйшых уладаў? Як гэта адбываецца, куды сцякаюцца грошы і як улады рэагавалі на нашыя расследаванні? У гэтым выданні мы падсумавалі чарговы год нашай працы ў журналісцкіх расследаваннях, аб'яднаўшы асобныя выяўленыя намі эпізоды ў агульную карціну.**

## КАРУПЦЫЙНЫЯ МЕТАСТАЗЫ Ў МЕДЫЦЫНЕ

Медыцына – адна з самых карумпаваных галінаў у Беларусі. Гэта пазалетась заявіў тагачасны генеральны пракурор Беларусі Аляксандр Канюк. І гаворка не пра падарункі дактарам за аперацыі. Асноўная карупцыя адбываецца пры бюджэтных закупах лекаў і абсталявання, распавядаў тагачасны старшыня КДБ Валер Вакульчык.



Сістэма працуе наступным чынам. Чыноўнік дамаўляецца з прыватным дастаўцам, што створыць яму штучную манаполію на пастаўкі дзяржаве і будзе ад імя дзяржавы плаціць яму за тавары ды паслугі ў разы даражэй, чым гэта было б пры канкурэнцыі. А бізнесовец за гэта плаціць персанальна чыноўніку адкат. То бок долю ад сваіх суперпрыбыткаў.




З 2017 да 2019 года сілавікі выкрылі шэраг такіх схемаў у межах маштабнага працэсу, які ў СМІ назвалі «справаю медыкаў». Тагачасны віцэ-прэм’ер Васіль Жарко заявіў, што не меў пра іх ніякага ўяўлення:



Апошнія 20 гадоў сістэмай аховы здароўя кіруе адзін чынавенскі клан. Яго роданачальніца – Людміла Пастаялка: паводле шэрагу СМІ, грамадзянская цешча Аляксандра Лукашэнкі.




У 2001 годзе Лукашэнка прызначыў яе намесніцаю міністра аховы здароўя, а год пазней – міністрам. Пераемнік і зямляк Пастаялкі Васіль Жарко працаваў з ёй у Берасцейскім дзіцячым шпіталі.




Калі Пастаялка паехала ў Менск, у міністэрства, Жарко перайшоў да яе на працу генеральным сакратаром у беларускі Чырвоны Крыж. У 2011 годзе Жарко, ужо будучы міністрам, прызначыў сваім першым намеснікам Дзмітрыя Піневіча, які займаў гэтую пасаду пры кожным новым міністры, па-

куль, урэшце, сам не стаў міністрам. Сяргей Сацук, рэдактар выдання Ej.by, кажа, што паказальныя крымінальныя справы схемаў не спынілі і ў іх па-ранейшаму прысутнічае Васіль Жарко:

«Схемы ўсе працуюць. Я ведаю. Уся, уся сістэма як яна была пабудаваная, уся і працуе. А вось гарача. Ну, я думаю, што так ці інакш ён дзесьці ў чымсьці бярэ ўдзел. Паколькі ў яго такія вялікія сувязі былі з усім бізнесам, проста сысці на пенсію і адпачываць ён не мог».

У 2010 годзе для чыноўнікаў Мінздароўя адкрываюцца залатыя магчымасці. Абвешчаная кампанія імпартазамяшчэння лекаў. Наладжваецца іх айчынная вытворчасць. А пад гэта адкрываюцца і новыя магчымасці зарабіць на сумнеўных схемах. У 2011 годзе сям’я Васіля Жарка прадае адну са сваіх кватэраў жонцы віцебскага бізнесоўца Аляксея Сычова.

Неўзабаве пасля згаданай асабістай угоды з Жарком Сычоў рэгіструе кампанію «Націвіта», якая нібыта пачынае вырабляць супрацьракавыя прэпараты. Насамрэч яна іх імпартавала і прадавала ведамству Васіля Жарко паводле коштаў, якія ў разы перавышалі рынкавыя.




З той абмежаванай інфармацыі пра закупы, што была ў інтэрнэце, мы налічылі шкоду бюджэту больш як на 40 мільёнаў сённяшніх рублёў.

Сяргей Сацук, рэдактар выдання Ej.by, кажа:

«Тыя, хто завышае ўдвая, напэўна, плацілі камусьці з тэндарнай камісіі, можа, яшчэ камусьці часам што плацілі. А тыя, хто завышае ў 5–10 разоў, у іх вельмі сур’ёзны «дах». Яны плацяць сур’ёзным людзям і на пастаяннай аснове».

У 2017 годзе пачынаецца рэзанансная справа медыкаў: масавыя арышты чыноўнікаў Мінздароўя і звязаных з імі бізнесоўцаў. За карупцыю. Але за некалькі месяцаў да першых арыштаў, у самыя следчыя дзеянні, Аляксандр Лукашэнка пераводзіць Жарко на новую пасаду: павышае да намесніка прэм’ер-міністра. Хлопчыкам для біцця – на перыяд судовых працэсаў з 2017 да 2019 года – прызначаюць чалавека з па-за абоймы Мінздароўя – Валерыя Малашку, які раней працаваў намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкаму.




Менавіта Малашку Лукашэнка прыцягваў да адказу:

«Вы куды глядзелі? Бо там затрыманыя беспасярэдне вашыя падначаленыя. Вы мне шчыра скажыце: вы здольныя кіраваць міністэрствам? Бо калі вы не здольныя, далей будзе горш».

Тым часам знаёмы Васіля Жарка як мінімум у рыэлтарскіх угодах – суўладальнік «Націвіты» Аляксей Сычоў – у выніку за шматразовыя хабары атрымаў штраф усяго толькі каля 20 тысяч долараў.




Прычым не ў справе «Націвіты», а за дзейнасць яшчэ адной сваёй фірмы – «Вітвар».




Яе мы таксама неаднаразова лавілі на завышаных коштах пры бюджэтных пастаўках. Штопраўда, Дзмітрый Піневіч, пасля таго як стаў міністрам, звярнуў увагу на расследаванне «Белсату», прыкінуўшыся, што да нашай публікацыі нічога пра гэтую схему не ведаў, хаця сам у 2019 годзе падпісваў сертыфікат GMP на фэйкавую вытворчасць «Націвіты».

У выніку «Націвіту» прымусілі бясплатна паставіць бюджэту лекаў роўна на тую суму, якую мы налічылі – 38 мільёнаў рублёў.




Але схема працягнулася гэтак жа, як і раней – як з «Вітварам», так і з «Націвітаю». Толькі бюджэтныя пераплаты цяпер ідуць на іншыя лекі.

Мы двойчы спрабавалі ўзяць каментар на гэтую тэму ў Дзмітрыя Піневіча. Адзін раз – каля дзвярэй Міндароўя. Другі раз – сёлета ў красавіку. Гэтым разам мы пачакалі яго ў ягоным прыёмным пакоі. Міністр зноў ад нас уцёк – у свой кабінет. А калі мы ўвайшлі следам, яго там ужо не было бачна. Дзе ён мог схавацца пры сваім немалым росце, можна толькі здагадвацца.

За той час, што Піневіч быў намеснікам Жарко, ён пабудаваў сабе катэдж, ацэначным коштам ад 250 тысяч долараў.




Сам Жарко займеў маёмасць агульным коштам каля паўтара мільёна долараў. А менавіта – 3-пакаёвая кватэра на Нямізе, апартаменты каля Драздоў і прыватны дом за Нацыянальнаю бібліятэкаю на вуліцы Глебава.



У 2019 годзе, пасля таго як скончыўся апошні судовы працэс у «справе медыкаў», міністрам прызначылі ўжо Уладзіміра Караніка, пра якога ў нас было асобнае расследаванне.

## СПУСЦІЛІ Ў КАНАЛІЗАЦЫЮ

Пакуль Жарко з Піневічам каардынавалі закупы лекаў, Каранік запраўляў рэканструкцыяй Менскага гарадскога анкалагічнага дыспансеру.




Туды яго ў 2011 годзе прызначыў галоўным доктарам камітэт сталічнага гарвыканкаму ў справе аховы здароўя, які ў тым жа годзе ачольваў Дзмітрый Піневіч. Летась Каранік урачыста разразаў стужку абноўленага дыспансеру, які падвоіў свае магчымасці ў выкананні анкалагічных аперацыяў. Вось толькі абнаўленне анкадыспансеру абышлося бюджэту ў 153 мільёны долараў – на 23 мільёны долараў даражэй, чым будаўніцтва прэзідэнцкай клінікі з нуля.

Чаму так дорага? Мы вывучылі адзін з тэндараў у межах гэтай рэканструкцыі: на закуп каналізацыі дзеля ўтылізацыі радыеактыўных адкідаў. Мы атрымалі альтэрнатыўную камерцыйную прапанову на гэтую каналізацыю ад знанай еўрапейскай фірмы. Выявілася, што ведамства Васіля Жарко пераплаціла за яе ўдвая.



Кіраўнік будаўнічага падраздзелу Міністэрства аховы здароўя Васіль Шубіч прызнаўся нам, што яны з Каранікам вызначылі падрадчыка на гэтую работу – беларускую фірму «Інкамед», яшчэ да праўдзення гандляванняў:

– Ён узяў за аснову праект радыеізатопных прыбораў, таго, што яны рабілі.

– Так, тое, што яны рабілі.

– Да тэндару?

– Так, да тэндару. Але мы абавязаныя былі правесці тэндар, абавязаныя былі яе пабудаваць як мае быць.

Схема апынулася простай. Усім канкурсантам выставілі ўмову: яны павінны былі мець беларускі сертыфікат на наладку і мантаж абсталявання, якога ні ў кога не было. Не меў яго і пераможца тэндару «Інкамед». Але ім яго афармілі праз год пасля закупаў, тым самым парушылі працэдуру дзяржзакупаў, што пацвердзіў кіраўнік будаўнічага падраздзелу Мінздароўя Васіль Шубіч:

– Атрымалі ліцэнзію прамінулым днём, хаця...

– Гэта звычайная практыка. Я вам цяпер скажу апошняе.

– Усіх прапускалі, у каго не было такой ліцэнзіі?

– Не, не ўсіх.

Пасля таго як Уладзімір Каранік стаўся міністрам аховы здароўя, да старых схемаў дадаліся закупы абсталявання на лекаванне пацыентаў з каронавірусам. Але пра гэта мы распавядзём у нашых новых расследаваннях. Цяпер Уладзімір Каранік ачольвае Гарадзенскую вобласць. Лукашэнка, ужо пасля нашага расследавання пра рэканструкцыю анкадыспансеру, назваў яго моцным кандыдатам на прэзідэнта.

Такім чынам, схемы з прыкметамі карупцыі ў медыцыне працягваюцца, не зважаючы на тое, што чыноўнік, які ўзначальвае гэтую галіну і адказвае за яе, ведае пра сітуацыю. А гэта значыць, схемы адмывання грошай працягваюцца са згоды прадстаўнікоў улады. Там, дзе мы іх ловім на пераплатах, яны спаганяюць нанесеную дзяржаве шкоду, як гэта было з сарака мільёнамі ў выпадку «Націвіты». Але на месца старых схемаў тут жа прыходзяць новыя, прычым з тымі ж удзельнікамі.

## СХЕМЫ ШЭРАГА КАРДЫНАЛА І БІЗНЕС-ІМПЕРЫЯ ЛУКАШЭНКІ

Зусім інакш выглядае падзел аднаго з галоўных прыродных багаццяў Беларусі – геаграфічнага становішча. Калі ў дзяржаўных закупах чыноўнікі дамаўляюцца пра адкаты з рознымі бізнесоўцамі, то лагістычным і кантрабандным бізнесам яны вырашылі заняцца самастойна. Два найбуйнейшыя прыватныя лагістычныя аператары ў Беларусі належаць наўпрост дарадцам двух самых набліжаных да Аляксандра Лукашэнкі чыноўнікаў. Гаворка пра «Брэміна Груп» і «Глобалкастам».



Першую ачольвае Аляксандр Зайцаў, які ўвайшоў у вялікі бізнес беспасярэдне з кабінету дарадцы Віктара Лукашэнкі.




Бенефіцыяр другой – нехта Яўген Жоўнер. Як выявіла нашае расследаванне, гэта нядаўні памочнік Віктара Шэймана, галавы Кіраўніцтва справамі прэзідэнта.




Сакрэт поспеху абедзвюх фірмаў просты. Па-першае, улады дазваляюць ім будаваць мытныя склады на памежных пераходах. Па-другое, ім дазволена пазбягаць выплатаў у бюджэт.

«Брэміна Груп» вызвалілі ад падаткаў увогуле. Гэтая ільгота ім дадзеная ўзамен на пабудову лагістычнага комплексу «Брэміна-Орша». А «Глобалкастам», напрыклад, сярод іншага, імпартуе вопратку пад выглядам анучаў і пазбягае такім чынам імпартных мытаў, якім улады абараняюць айчынны «Беллёгпрам».

Калі ж фуры з кантрабандаю ловяць расейцы, то беларускія суды апраўдваюць лагіста: маўляў, ён не ведаў, што ў фурах – кантрабанда, хаця ён сам гэтыя тавары купляе, размытняе і часткова перапрадае ўласным структурам.

Аляксей Коранеў, аналітык групы кампаніяў «Фінам»:

«Насамрэч буйныя пастаўкі грузу ажыццяўляюцца цалкам адкрыта фурамі альбо падмяняецца ў дакументах груз. Гэта значыць, напрыклад, замест адзення афармляецца тканіна, а тканіны абкладаюцца значна меншым мытным зборам. Паколькі ішла вялікая колькасць санкцыйных прадуктаў, такая практыка атрымала шырокі распаўсюд».

Сярод іншых звышпрыбытковых паставак названых лагістаў на беларускі і расейскі рынак – харчы, абкладзеныя расейскімі санкцыямі, кітайскі шырспажыў, а таксама кветкі. Улады Беларусі стварылі для абранага кола тутэйшых фірмаў кветкавы падатковы афшор. Дзякуючы гэтай схеме Беларусь, якая раней не экспартавала кветак наагул, захапіла бальшыню расейскага рынку. Пастаўкі дасягаюць сцень мільёнаў долараў штогод.

Аляксей Анціпаў, старшыня Нацыянальнай асацыяцыі кветкаводаў у Расеі:

«Нажываюцца канкрэтныя людзі, дзяржава беларуская губляе грошы. Проста губляе. Па нашай ацэнцы, дзяржава на асаблівым зборы ПДВ на недзе 17 мільярдаў рублёў губляе штогод. З гэтага ПДВ мільярдаў 6-7 вашых».

Пасля нашага расследавання Расея пачала спыняць на сваёй мяжы фуры з кветкамі.

Аднак, як паведамляюць нашыя крыніцы, заблакаваныя грузы ўсё роўна ідуць у Расею, але праз тэрыторыю Еўразвязу. Вяртаючыся канкрэтна да «Глобалкастаму», яе першапачатковаю саўладальніцаю была грамадзянка Беларусі Ганна Пушкарова.




Цягам нашага расследавання мы высветлілі, што ў 2012 годзе гэтая 22-гадовая выпускніца ВНУ родам з Дзяржынску раптоўна стала ўласніцаю прэміум-нерухомасці ў цэнтру Менску і адкрыла краму дзіцячай вопраткі. А ў хуткім часе стала і суўласніцаю «Глобалкастаму». Незалежныя СМІ са спасылкаю на крыніцы неаднаразова намякалі на інтымныя стасункі Пушкаровай і Віктара Шэймана.

Ганну Пушкарову мы не знайшлі, але сустрэліся з ейнаю сястрою Юліяй, якая паабяцала перадаць праз Ганну інфармацыю для Шэймана.

Як мы высветлілі, напрыканцы мінулага года «Глобалкастам» рэарганізавалі. Узнікла кампанія «Глобалкастам-менеджмент», звязаная з Кіраўніцтвам справамі прэзідэнта.

Гэтак, «Глобалкастам-менеджменту» належыць 75 % у кампаніі «Белгеапошук». Астатнімі 25 % валодае дзяржаўнае прадпрыемства «Белзамежгандаль», падначаленае Кіраўніцтву справамі прэзідэнта. У адкрыцці пункту мытнага афармлення «Глобалкастам» у індустрыйным парку «Вялікі

камень» браў удзел кіраўнік справамі прэзідэнта Віктар Шэйман.

Раней кампанія «Глобалкастам-менеджмент» валодаў «ГардСэрвісам».

Гэта адзіная ў Беларусі прыватная структура, якой Лукашэнка дазволіў ужываць зброю.

Цяпер «ГардСэрвісам» валодае Аляксандр Мятла, кіраўнік дабрачыннага фонду «Памяць Афгану».




Фонд падтрымліваўся Віктарам Шэйманам. Мы патэлефанавалі ў Кіраўніцтва справамі прэзідэнта і папрасілі даць нумар Яўгена Жоўнера, дзейнага бенефіцыяра «Глобалкастаму». Там гэтае прозвішча пазналі, сакратарка ведала, як яго клічуць па бацьку і паабяцала нам ягоны тэлефон, але пазней перадумала. Сам Яўген Жоўнер з намі размаўляць адмовіўся.

Яшчэ адзін велізарны кантрабандны бізнес – гэта цыгарэты. Маркі гарадзенскай тытунёвай фабрыкі «Нёман» займаюць істотныя долі як у Еўразвязе, так і ў Расеі. Збыт «Нёмну» кантралюе суўладальнік «Брэміна Груп», яшчэ адзін выхадзец з Кіраўніцтва справамі прэзідэнта Аляксей Алексін.

Афіцыйная пазіцыя ўладаў Беларусі – маўляў, на кантрабандзе цыгарэтаў нажываюцца звычайныя людзі, і бізнес гэта выключна народны. Але нашыя крыніцы на літоўскай і польскай мытнях сцвярджаюць, што асноўныя аб’ёмы ў Еўразвяз перавозяцца ў запламбаваных грузах дзяржаўных экспарцёраў калійных і азотных угнаенняў. Шарунас Чарняўскас, кіраўнік расследавальніцкага праекту Siena.lt, распавядае:

«Праз Літву ідзе велізарны паток угнаенні, выробленых у Беларусі. Гэта ў асноўным «Беларуськалій» і «Горадня-Азот». І гэты паток выкарыстоўваецца для кантрабанды, літоўскія мытнікі таксама пацвердзілі, што грузы гэтых дзвюх кампаніяў часта трапляюцца з грузамі кантрабанды».

Былы работнік «Горадня-Азоту» Юрый Рававы распавядае, як яны неяк знайшлі груз кантрабандных цыгарэтаў у запламбаваных вагонах на пагрузцы. Але наступстваў іхная знаходка не мела.

«Далі каментар, што так, мы былі на заводзе і сіламі адміністрацыі былі знойдзеныя папяросы, вядзецца нейкае расследаванне. Але трэба разумець, што пакараных да гэтага часу няма».

Алексін і Зайцаў пакуль не трапілі пад заходнія санкцыі. Але загадзя пераафармілі свае актывы на дзяцей і работнікаў. Гэтак жа зрабілі і ўладальнікі «Dana Holdings», якія трапілі пад санкцыі за тое, што без відавочных прычынаў Аляксандр Лукашэнка вылучыў ім бясплатных земляў для забудовы на сотні мільёнаў доляраў, забавязаў дзяржаўныя арганізацыі бясплатна пабудаваць ім шэраг інфраструктурных камунікацыяў, а звышпрыбыткі вызваліў ад падаткаў.




Як выявіла нашае расследаванне, браты Карычы намінальна вывелі свае кампаніі з-пад «Dana Holdings», а іх канчатковым бенефіцыярам стаў араб Мустафа аль-Тобгі, дырэктар фірмы, якая належыць Карычам.




Апрача таго, мы даведаліся, што жонка Віктара Лукашэнкі Лілія, якая раней працавала намесніцаю дырэктара адной з кампаніяў холдынгу, цяпер кіруе галерэяй «Арт Хаос», якая належыць кіпрыёцкай фірме.







Цягам апошняга года «Dana Holdings» падаравала сваім жыльцам тысячы карцінаў беларускіх мастакоў. Істотная колькасць была набытая ў галерэі нявесткі Лукашэнкі.

З якою мэтай і на якіх умовах бенефіцыяр мільярдных ільготаў ад Аляксандра Лукашэнкі робіць маштабныя закупы ў галерэі? З гэтым пытаннем мы звярнуліся да Ліліі Лукашэнкі пры асабістай сустрэчы, аднак яна адмовілася адказваць на нашыя пытанні.

## БРУДНАЯ СПРАВА ЎЛАДАЎ

Асобна ў шэрагу нашых антыкарупцыйных расследаванняў стаіць праграма пра тое, чаму жыхары беларускіх гарадоў усё часцей зазнаюць праблемы з вадой у кранах. А забруджаная яна, маўляў, праз тое, што яе шмат дзе перасталі ачышчаць пры выкідзе ў вадаёмы. Мы пастанавілі праверыць забруджанасць айчынных вадаёмаў і ўзялі пробы вады ў рэках каля Наваградку і побач з Лідаю. Бо мясцовыя жыхары скардзіліся нам на пах вады з ракі і зазначалі, што ў рацэ час ад часу адбываецца мор рыбы, заўважалі яны і мёртвых баброў. Улады такія з’явы заўсёды спісваюць на прыродныя анамаліі ды разводзяць рукамі, але вось што паказалі вынікі аналізу пробаў вады. У Наваградку – перавышэнне нормы па нафтапрадуктах удвая. Нітрытаў, якія правакуюць сэрцавыя і страўнікавыя разлады, утрая больш за норму. Цвёрдых іншародных часцінак – у 12 разоў болей, чым мае быць.




Мы спыталі старшыню Наваградскага ЖКГ, у чым прычына перавышэння нормаў.

«А што мне сказаць. Ачышчальныя працуюць у штатным рэжыме, усё наяўнае абсталяванне задзеянае».

Праз паўгода пасля выхаду расследавання візуальныя прыкметы забруджання нікуды не зніклі.

Такім чынам, у выніках нашага чарговага сезону журналісцкіх расследаванняў можна зазначыць, што апошнімі гадамі на фоне пагаршэння дабрабыту шараговых беларусаў улады вельмі істотна павялічылі прысутнасць схемаў з прыкметамі карупцыі ды кумаўства ў шэрагу найважнейшых галінах беларускай эканомікі. У бюджэтнай галіне павялічыўся «распіл». А найбольш прыбытковыя прыватныя галіны ўзялі пад свой кантроль чыноўнікі, дэлегаваныя ў бізнес з найвышэйшых урадавых кабінетаў краіны.